79.1
Д 427

+2 Д95

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ
КУЛЬТУРЫ І МАСТАЦТВАЎ»

УДК 069 (476.5 – 21) (043.3) + 008 (476.5 – 21) (043.3)

**ДЖУМАНТАЕВА**
**Тамара Аляксандраўна**

# МУЗЕІ ПОЛАЦКА Ў КУЛЬТУРНАЙ ПРАСТОРЫ ГОРАДА

Аўтарэферат
дысертацыі на суісканне вучонай ступені кандыдата культуралогіі
па спецыяльнасці 24.00.03 – музеязнаўства, кансервацыя і
рэстаўрацыя гісторыка-культурных аб'ектаў

Репозиторий БГУКИ

Мінск 2009

Работа выканана на кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства УА «Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў»

Навуковы кіраўнік: **Трусаў Алег Анатольевіч,**
кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства УА «Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў»

Афіцыйныя апаненты: **Гужалоўскі Аляксандр Аляксандравіч,**
доктар гістарычных навук, дацэнт, прафесар кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў Беларускага дзяржаўнага універсітэта

**Данскіх Сяргей Уладзіміравіч,**
кандыдат культуралогіі, дацэнт кафедры культуралогіі УА «Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы»

Апаніруючая арганізацыя: УА «Віцебскі дзяржаўны універсітэт імя П.М. Машэрава»

Абарона адбудзецца 28 мая 2009 г. у 16.00 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 09.03.01 пры УА «Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў» па адрасе: 220001, Мінск, вул. Рабкораўская, 17, чытальная зала. E-mail: buk@buk.by, тэл. вучонага сакратара 222-83-36.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы УА «Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў».

Аўтарэферат разасланы 21 красавіка 2009 г.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый
кандыдат мастацтвазнаўства,
дацэнт І.А. Смірнова

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

Музей у сучаснай музеялогіі разглядаецца як гістарычна абумоўлены шматфункцыянальны інстытут сацыяльнай памяці, з дапамогай якога рэалізуецца грамадская патрэбнасць у адборы, зберажэнні і рэпрэзентацыі групы культурных і прыродных аб'ектаў, усведамляемых грамадствам як каштоўнасці, якія неабходна перадаваць з пакалення ў пакаленне. Зыходзячы з гэтага музеі Полацка ўспрымаюцца беларускімі музеязнаўцамі як захавальнікі багатых старонак айчыннай культуры, як складовая частка культурна-гістарычнай прасторы горада. Яны са сваімі унікальнымі экспазіцыямі з'яўляюцца своеасаблівымі культурнымі тэкстамі. Рэпрэзентуючы наведвальніку тыя альбо іншыя артэфакты культуры, уводзячы яго ў сімвалічную рэальнасць, музеі здзяйсняюць у сваёй практычнай рабоце пераход ад мінулага да сучаснага і нярэдка робяць наведвальніка непасрэдным актыўным удзельнікам той ці іншай падзеі.

Полацкія музеі ў другой палове XX ст. пашырылі поле сваёй дзейнасці, уключыўшы ў працэс музеефікацыі не толькі асобныя аб'екты, але і культурную прастору горада ў цэлым. Яны маюць розныя формы, метады і спосабы арыентацыі наведвальніка ва унікальнай і разнастайнай культурнай прасторы горада і эфектыўна ўплываюць на засваенне суб'ектамі культуры сацыяльнага вопыту беларусаў. Што тычыцца музеяў-запаведнікаў, то яны наогул могуць служыць сімвалічнай крыніцай дыстантных вобразаў вялікага маштабу. Так, вобраз Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка рэдукуецца да аднаго сімвала – Сафійскага сабора, які ў сваю чаргу факусіруе ў свядомасці вобраз Беларусі ў цэлым.

У апошнія гады ў сувязі з тым, што ўзрасла ўвага грамадства да феномена музея, пашырылася колькасць і тэматыка культуралагічных і музеялагічных даследаванняў. Тым не менш, асобныя рэгіянальныя музейныя аб'яднанні нашай краіны засталіся пакуль што па-за ўвагай даследчыкаў, не зважаючы на тое, што роля музея ў рэгіянальнай культурнай прасторы ўзрастае. Зварот да даследавання працэсаў фарміравання і развіцця музеяў Полацка, а таксама іх месца і ролі ў культурнай прасторы горада, абумоўлены тым, што азначаная музеязнаўчая праблематыка ў цяперашні час амаль што не прадстаўлена ў навуковых даследаваннях беларускіх навукоўцаў, нягледзячы на існаванне ў Полацку шматлікіх музеяў і мнагапланавасць іх дзейнасці.

**Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі, тэмамі**

Дысертацыя з'яўляецца часткай навуковай праграмы даследаванняў кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства УА «Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў» па тэме «Гісторыя духоўнай і матэрыяльнай культуры Беларусі». Даследаванне праводзілася ў рамках дзяржаўнай праграмы «Функцыянаванне і развіццё культуры Рэспублікі Беларусь да 2005 года», зацверджанай Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь – а таксама дзяржаўнай «Комплекснай доўгатэрміновай праграмы развіцця Полацка і Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка на 2000–2005 гг.», зацверджанай Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

**Мэта і задачы даследавання**

Мэта даследавання – выявіць дэтэрмінанты, сутнасць і змест музеефікацыі аб'ектаў культурнай прасторы Полацка. У сувязі з пастаўленай мэтай у дысерта-

БІБЛІЯТЭКА
Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў
ІНВ. №



Репозиторий БГУКИ

цыйным даследаванні вырашаюцца наступныя задачы:
· раскрыць унікальнасць і самабытнасць культурнай прасторы Полацка як аб'екта музеефікацыі;
· вызначыць перыядызацыю музеефікацыі артэфактаў матэрыяльнай і духоўнай культуры Полацка;
· паказаць шматаспектную дзейнасць суб'ектаў культуры па фарміраванні музейнай сеткі як кампанента культурнай прасторы горада;
· раскрыць спецыфіку тыпаў і відаў полацкіх музеяў і асноўныя накірункі іх дзейнасці;
· распрацаваць сучасную мадэль функцыянавання і далейшага развіцця Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка.

**Аб'ект і прадмет даследавання**

Аб'ект і прадмет даследавання вызначаны зыходзячы з мэты і задач работы. У якасці аб'екта даследавання ўзята сукупнасць музеяў Полацка, пачынаючы з Музея езуіцкага калегіума (канец XVIII ст.) і да сучасных музеяў запаведніка. Прадметам даследавання з'яўляецца працэс фарміравання і развіцця музеяў горада як складовай часткі культурнай прасторы. Выбар аб'екта і прадмета даследавання абумоўлены тым, што развіццё музея як сацыякультурнага інстытута дазваляе ўспрымаць яго ў якасці захавальніка і транслятара культурнай спадчыны.

**Асноўныя палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону:**

1. Культурная прастора Полацка сфарміравалася ў выніку шматвяковай палітычнай, сацыяльна-эканамічнай і культуратворчай дзейнасці беларускага народа. Яна прадстаўлена унікальнымі гістарычнымі і культурнымі помнікамі, багатай нематэрыяльнай спадчынай, шэраг артэфактаў якой маюць сусветнае значэнне (Сафійскі сабор, Вялікі пасад, праграма фрэскавага роспісу Спаса-Праабражэнскай царквы XII ст., Полацкае Евангелле XII ст., стыхіра Св. Еўфрасінні Полацкай, кніжны і рукапісны збор Сімяона Полацкага і інш.). Асаблівасцю полацкай культурнай прасторы з'яўляецца яе аўтэнтычнасць, разнастайнасць і адносна добрая захаванасць. Усведамленне універсальнасці і агульначалавечай значнасці культурнай спадчыны Полацкага рэгіёна садзейнічала развіццю збіральніцкай і калекцыйнай дзейнасці, на аснове якой ужо ў XVIII ст. распачаўся працэс музеефікацыі асобных помнікаў гісторыі і культуры Полаччыны. З цягам часу музеі горада становяцца складовай часткай рэгіянальных культурных працэсаў, а музейная сетка горада выдзяляецца ў самастойны культурна-гаспадарчы комплекс.

Музеефікацыя культурнай прасторы Полацка дэтэрмінавана гістарычнай роляй, якую ён адыгрываў на працягу стагоддзяў у палітычным, эканамічным, сацыяльным, канфесійным, культурным жыцці Беларусі.

2. Гіпатэтычна працэс музеефікацыі артэфактаў культурнай спадчыны Полацка можна падзяліць на наступныя перыяды:

1780–1926 гг. – ад узнікнення першага музея навучальных устаноў да стварэння Акруговага краязнаўчага музея;
1926–1967 гг. – разгортванне дзейнасці Краязнаўчага музея;
1967–2008 гг. – складванне і развіццё структуры Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка.

Кожны з названых перыядаў меў адметныя рысы ў музейнай дзейнасці, якія трансфармаваліся ў агульнакультурныя традыцыі, што ўзмацніла ўплыў музеяў на



развіццё гарадской культурнай прасторы. Музеі Полацка ў даследуемы перыяд былі пэўнымі сацыякультурнымі інстытутамі, гарантамі забеспячэння аховы гісторыка-культурнай спадчыны горада, цэнтрамі гуманітарных навуковых даследаванняў і важнымі асветніцкімі ўстановамі. Значнае пашырэнне ў бок новых тыпаў і відаў музеяў, ад класічных да музеефікацыі асобных помнікаў і цэлых тэрыторый, сведчыць аб тым, што сучасныя полацкія музеі перажываюць істотныя змены ў рэчышчы агульных трансфармацый, якія адбываюцца ў грамадстве і культуры. Дадзенае даследаванне і аналіз музейнай практыкі даюць магчымасць меркаваць, што ў XXI ст. роля музеяў у глабальнай прасторы культуры і ў асобна ўзятай культурнай прасторы горада будзе ўзрастаць.

3. Музеефікацыя рэгіянальнай культурнай спадчыны Полаччыны непасрэдна звязана з дзейнасцю канкрэтных суб'ектаў культуры, без якіх стварэнне музеяў і развіццё музейнай справы ў Полацку было б немагчыма. Менавіта дзякуючы іх дзейнасці былі створаны полацкія музеі і ўсвядомлена важнасць аховы і рэпрэзентацыі гісторыка-культурнай спадчыны даследуемага рэгіёна. Ля вытокаў музеефікацыі помнікаў гісторыі і культуры горада знаходзіліся Г. Грубер, Ф. Рыка, Ю. Цітовіч. Выключную ролю ў музейным будаўніцтве ў першай палове XX ст. адыгралі В. Гаціх, Г. Дзідэнка, П.Дэйніс, А. Еленяў, В. Карэліна, У. Курэк, С. Мялешка, П.Пяроўскі і інш. Важкі ўклад у стварэнне музея-запаведніка ўнеслі Н. Андрэева, А. Комычаў, В. Краско, В. Купрыянаў, Г. Ладзісава, І. Мацюшкін, В. Слюнчанка, В.Траццякова, Э. Хазін і інш.

4. У працэсе музеефікацыі былі створаны розныя віды і тыпы музеяў, сярод якіх вызначаліся музеі навучальных устаноў (езуіцкага калегіума, піярскага вучылішча, кадэцкага корпуса), Краязнаўчы музей, Музей баявой славы, Музей-кватэра Героя Савецкага Саюза З.М. Тусналобавай-Марчанка, Музей гісторыі архітэктуры Сафійскага сабора, Музей беларускага кнігадрукавання, Музей-бібліятэка Сімяона Полацкага, Музей традыцыйнага ручнога ткацтва Паазер'я, Мастацкая галерэя, Дзіцячы музей, Прыродна-экалагічны музей.

Музейная сетка Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка складаецца з 11 музеяў і 65 аб'ектаў, унесеных у Дзяржаўны Спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. Супрацоўнікамі музея-запаведніка праводзіцца шматаспектная дзейнасць: навукова-даследчая, навукова-фондавая, захавальніцкая, адукацыйная, выхаваўчая, інфармацыйная, рэстаўрацыйная, выставачная, эканамічна-фінансавая, міжнародная, культуратворчая.

5. З улікам спецыфікі рэгіянальнай культурнай спадчыны даследаванне музеефікацыі культурна-гістарычнай прасторы Полацка дазволіла выпрацаваць функцыянальную мадэль музея-запаведніка. Аб'ектам музеефікацыі павінен стаць увесь гістарычны цэнтр горада. З гэтай мэтай неабходна ажыццявіць комплексную рэгенерацыю ансамбля галоўнай гарадской плошчы. Музеефікацыя помнікаў культуры і гісторыі павінна весціся з улікам спецыфікі аб'ёмна-прасторавага планіровачнага каркаса, канфігурацыі Дзвіны і Палаты, агульна-гарадскога сілуэта, архітэктурных ансамбляў, якія захаваліся. Музей-запаведнік не можа функцыянаваць без наяўнасці сучаснага рэстаўрацыйнага цэнтра, укамплектаванага кваліфікаванымі кадрамі. Гарадскую прастору неабходна напоўніць музеефікаванымі археалагічнымі аб'ектамі і малымі архітэктурнымі формамі. Пазбегнуць шкоднай нагрузкі (прымусовай амартызацыі) на музей-запаведнік можна пры наяўнасці спецыяльнай мадэлі культур-



Рэпазіторый БДУКІ

нага турызму, якая карэнным чынам адрозніваецца ад звычайных формаў масавага турызму. Ахова і рэпрэзентацыя музеямі культурнай спадчыны залежыць ад супрацоўніцтва запаведніка з міжнароднымі арганізацыямі (напрыклад, ЮНЕСКА, ІКАМОС). У будучым у Полацку можна будзе стварыць шэраг музеяў (старога горада, зброі, археалогіі, ганзейскага гандлю, знакамітых палачан, літаратуры, народнай медыцыны і інш.), якія стануць складовай часткай запаведніка.

**Асабісты ўклад суіскальніка**

Увесь аб'ём дысертацыйнага даследавання выкананы аўтарам самастойна. Дысертацыя з'яўляецца першым у айчыннай культуралогіі даследаваннем ролі і месца музея ў культурнай прасторы горада. Дадзеная работа ўяўляе сабой спробу сістэматызацыі гісторыі музеяў Полацка. Новым аспектам даследавання ў беларускай культуралогіі і музеялогіі з'яўляецца мэтанакіраванае выкарыстанне сацыякультурнага падыходу да аналізу музея як сацыяльна-культурнага інстытута, асэнсавання яго месца і ролі ў культурнай прасторы горада. На прыкладзе музеефікацыі культурнай спадчыны Полацка даследуюцца такія паняцці, як *феномен гарадскога музея, музей як культурны кампанент гарадской прасторы, музеефікацыя гістарычнай часткі горада, узнікненне музейнага асяроддзя ў гарадской прасторы*, яго роля ў грамадстве і фарміраванне прафесіі музейнага супрацоўніка. У дысертацыі падрабязна аналізуецца дзейнасць музея-запаведніка як спецыфічнай музейнай адзінкі і яго роля ў захаванні гісторыка-культурнай спадчыны.

Навізной характарызуецца дакументальны архіўны матэрыял, уключаны ўпершыню ў навуковы ўжытак; аўтарам даецца новая інтэрпрэтацыя шэрагу дакументаў, звязаных з гісторыяй музеяў і іх ролі ў развіцці культурнай прасторы горада. Прааналізаваны комплекс матэрыялаў дазволіў па-новаму асэнсаваць месца і ролю музеяў запаведніка ў культурнай прасторы Полацка, даў магчымасць на еўрапейскім гістарычным фоне высветліць традыцыі ў развіцці музейнай справы на працягу двух стагоддзяў і самастойна выпрацаваць мадэль захавання гісторыка-культурнай спадчыны праз музеефікацыю унікальнай гістарычнай тэрыторыі.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі**

Асноўныя палажэнні даследавання адлюстраваны ў публікацыях і выступленнях на 19 навуковых канферэнцыях, сімпозіумах і семінарах міжнароднага ўзроўню: І і ІІ канферэнцыях па праблемах музеефікацыі унікальных гістарычных тэрыторый (Мінск–Заслаўе–Дудуткі, 22–24 чэрвеня 1995г.; Бачэйкава–Полацк, 14–16 кастрычніка 1996 г.); VI канферэнцыі Асацыяцыі «Гісторыя і камп'ютэр» (Звенігарад, 26–29 сакавіка 1998 г.); канферэнцыі «Русь і Скандынавія» (Пскоў, 25–28 мая 1998 г.); канферэнцыі «Агульная спадчына. Культура зямель былой Рэчы Паспалітай» (Варшава, 18–20 кастрычніка 1999 г.); навуковай гісторыка-краязнаўчай канферэнцыі, прысвечанай 75-годдзю Полацкага краязнаўчага музея (Полацк, 18–19 мая 2001г.); канферэнцыі «Музеі і культурная спадчына як частка глабальнай інфармацыйнай прасторы» (Мінск–Полацк, 8–11 красавіка 2002 г.); VIII канферэнцыі Асацыяцыі «Гісторыя і камп'ютэр» (Санкт-Пецярбург, 26–29 чэрвеня 2002 г.); IV канферэнцыі «Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі» (Полацк, 23–24 кастрычніка 2002 г.); канферэнцыі «Праблемы гістарычных экспазіцый музеяў у постсацыялістычны перыяд» (Мінск, 26–28 верасня 2003 г.); канферэнцыі «Архітэктура і археалогія Старажытнай Русі», прысвечанай 100-годдзю М.К. Каргера (Санкт-Пецярбург, 26–28 лістапада 2003 г.); навуковай канферэнцыі «Прадметы



літургічнага ўжытку і асабістай набожнасці XI-XIII стст.» (Масква, 10–12 мая 2004 г.); семінары па музеялогіі «Перамяшчэнне межаў–змена ідэнтычнасці» (Вільнюс–Брэст–Львоў, 17–24 верасня 2005 г.); навуковай канферэнцыі «Чалавек, культура і грамадства ў кантэксце глабалізацыі» (Масква, 25–27 лістапада 2005 г.); навукова-практычнай канферэнцыі «Музеі Беларусі і Літвы: шляхі і перспектывы развіцця ў XXI стагоддзі» (Мінск, 11–14 кастрычніка 2006 г.); навуковай канферэнцыі «Спадчына ў эпоху сацыякультурных трансфармацый» (Масква, 1–2 снежня 2006 г.); навукова-практычнай канферэнцыі «Ахова, даследаванне і рэстаўрацыя помнікаў культуры», прысвечанай 100-годдзю Д.С. Ліхачова (Санкт-Пецярбург, 24–27 красавіка 2007 г.); навуковым сімпозіуме «Час культуралогіі», прысвечаным 75-годдзю Расійскага інстытута культуралогіі (Масква, 23–26 мая 2007 г.); навуковай канферэнцыі «Культурная спадчына: дынаміка змен» (Швецыя–Вісбі, 26–30 верасня 2007 г.). Шэраг палажэнняў даследавання адлюстраваны ў публікацыях і выступленнях на выніковых навукова–практычных канферэнцыях, якія штогод ладзяцца ў Нацыянальным Полацкім гісторыка-культурным музеі-запаведніку (1996–2008 гг.).

**Апублікаванасць вынікаў работы**

Вынікі даследавання знайшлі адлюстраванне ў 35 публікацыях аўтара, 3 артыкулы з якіх апублікаваны ў рэцэнзуемых часопісах (2,5 аўтарскага аркуша), 3 артыкулы – у навуковых часопісах і зборніках, 9 – у зборніках матэрыялаў канферэнцый, 4 – у зборніках тэзісаў дакладаў, 1 – у фотаальбоме, 12 – у энцыклапедычных выданнях і перыядычным друку, 3 – у рэкламных выданнях і буклетах. Агульны аб'ём апублікаваных работ складае 7,5 аўтарскага аркуша.

**Структура і аб'ём дысертацыі**

Структура дысертацыі вызначана логікай выкладання матэрыялу і ўтрымлівае: уводзіны; агульную характарыстыку работы; асноўную частку, якая складаецца з чатырох глаў; заключэнне; бібліяграфічны спіс і восем дадаткаў.

Поўны аб'ём дысертацыі складае 165 старонак, з іх 117 старонак займае асноўны тэкст, 20 старонак – бібліяграфічны спіс, які ўтрымлівае спіс выкарыстаных крыніц (209 найменняў на беларускай, рускай, англійскай і польскай мовах) і спіс публікацый аўтара (35 найменняў на беларускай і рускай мовах), 28 старонак займаюць дадаткі.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ДЫСЕРТАЦЫІ

***Ва ўводзінах і агульнай характарыстыцы работы*** даецца абгрунтаванне выбару тэмы даследавання, яе актуальнасці, характарызуецца сучаснае становішча праблемы, сувязь работы з навуковымі праграмамі, вызначаюцца мэты, задачы, прадмет і аб'ект даследавання, раскрываецца навуковая навізна работы, фармулююцца асноўныя палажэнні, якія выносяцца на абарону; адлюстроўваюцца: апрабацыя вынікаў даследавання, колькасць апублікаваных работ, структура і аб'ём дысертацыі.

**У першай главе *«Тэарэтыка–метадалагічныя асновы даследавання»*** разглядаецца шэраг тэарэтычных пазіцый замежных і айчынных навукоўцаў у адносінах да культурнай прасторы горада і інстытута музея; даецца метадалагічнае абгрунтаванне праведзенага даследавання.

**У раздзеле 1.1 *«Агляд першакрыніц і літаратуры па даследуемай праблеме»*** разглядаюцца работы, якія маюць дачыненне да тэмы дысертацыі, аналізу-



Репозиторий БГУКИ

ецца ўзровень распрацаванасці тэматыкі, характарызуецца сучасны стан вывучэння праблемы, паказваецца неабходнасць яе даследавання. Абгрунтаванне аўтарскай пазіцыі зрабіла неабходным аналіз і пераасэнсаванне шырокага кола пытанняў. Былі ўлічаны агульнафіласофскія падыходы да музея і культурнай прасторы, якія прадстаўлены ў айчыннай і замежнай літаратуры (А.В. Бабаева, І.І. Горлава, Я.Д. Грыгаровіч, В.П. Грыцкевіч, Э.К. Дарашэвіч, М.С. Каган, У.М. Конан, М.І. Крукоўскі, І.Я. Левяш, Т.Ф. Ляпкіна, А.М. Масценіца, М.А. Нікішын, С.В. Пшанічная, А.І. Смолік, Э.А. Шулепава, Т.Ю. Юрэнева і інш.). З гэтай нагоды прыводзіцца пералік асноўных тэарэтычных прац, якімі карысталася даследчыца для вызначэння метадалагічных арыенціраў і патэнцыялу трактоўкі праблем інстытуцыянальных асаблівасцей музея і культурнай прасторы горада.

Даследаваны пісьмовыя крыніцы (неапублікаваныя і апублікаваныя). Да *неапублікаванай* часткі першакрыніц аднесены значны фактычны матэрыял па тэме дысертацыі, які быў выяўлены ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі, Рукапісным аддзеле бібліятэкі Віленскага універсітэта, Дзяржаўным гістарычным архіве Літвы, Занальным дзяржаўным архіве ў г. Полацку, фондах Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка. Большая яго частка ўпершыню ўведзена ў навуковы ўжытак.

Гістарыяграфія пытання прадстаўлена манаграфіямі і артыкуламі айчынных і замежных навукоўцаў, якія ў розныя часы, пачынаючы з канца XIXст., звярталіся да гісторыі полацкіх музеяў і развіцця музейнай справы ў рэгіёне і на еўрапейскай прасторы (Л.В. Аляксееў, Й. Бенеш, Т.Б. Блінова, Б. Брэжга, В.П. Вікенцьеў, Ф.К. Гіжыцкі, В.В.Глiннік, А. Грэгарава, А.А. Гужалоўскі, І. Кадульска, М. Каламайская-Саед, А.М. Калбаска, М.А.Каулен, Г.А. Каханоўскі, Д.С. Ліхачоў, Е.Г. Марозава, М.Я. Марошкін, У.Ф. Мартынаў, А.К. Марэль, С.М. Мялешка, В.П. Пракапцова, Д.А. Равіковіч, А.П. Сапуноў, А.Б. Сташкевіч, З. Странскі, А.А. Сундзіева, М.М. Шчакаціхін, М.М.Яніцкая, А.А. Ярашэвіч і інш.).

Спецыяльных абагульняючых работ па вывучэнні месца і ролі музеяў Полацка ў яго культурнай прасторы пакуль што не існуе. Дадзеная дысертацыя з'яўляецца першай спробай прааналізаваць працэс музейнага будаўніцтва ў старажытным горадзе і спрагназаваць яго ўплыў на развіццё гарадской культурнай прасторы.

**У раздзеле 1.2** ***«Метадалогія і метады праведзенага даследавання»*** ўтрымліваецца абгрунтаванне выбару дысертантам навуковых падыходаў, з дапамогай якіх вырашаюцца пастаўленыя ў дысертацыі задачы. Метадалагічная аснова даследавання грунтуецца на канцэптуальных палажэннях тэорый інстытуцыялізацыі, сацыяльнай камунікацыі, аксіялогіі, фенаменалогіі, музейнай атрыбуцыі, пабудовы экспазіцыі, фондавай работы, музейнай стылістыкі, якія былі распрацаваны замежнымі і айчыннымі філосафамі, культуролагамі, гісторыкамі і музеёлагамі (М.М. Бахцін, М. Вебер, Я.Д. Грыгаровіч, А.А. Гужалоўскі, Э. Гусерль, М.С. Каган, М.А. Каулен, У.М. Конан, М.І. Крукоўскі, У.Ф. Мартынаў, Т. Парсанс, А.І. Смолік, А. Тойнбі, М. Хайдэгер, І.В. Чэпкунова, Э.А. Шулепава, Т.Ю. Юрэнева і інш.). Гэтыя палажэнні ўтрымліваюць розныя погляды на разуменне сутнасці, структуры і функцый культуры, ролі і месца музеяў у яе захаванні і рэпрэзентацыі, адносін асобы і грамадства, што было прааналізавана і выкарыстана пры пабудове канцэпцыі даследавання і раскрыцці тэмы дысертацыі.



У працэсе даследавання аўтар абапіралася на прынцыпы дыялектычнай логікі: аб'ектыўнасць, гістарызм і сістэмнасць. Галоўным навуковым метадам з'яўляецца параўнальна-гістарычны з выкарыстаннем канкрэтна-гістарычнага падыходу. Для вывучэння культурнай прасторы выкарыстаны параўнальна-гістарычны метад, які закліканы рабіць аналіз усіх элементаў культурнай спадчыны рэгіёна. Ён не вырывае культуру з кантэксту гістарычнага працэсу, у якім яна развівалася. Музей у культурнай прасторы горада разглядаецца як асобая сацыякультурная з'ява, што магчыма толькі ў рамках фенаменалагічнага метаду даследавання культуралагічных працэсаў.

Даследаванне працэсу музеефікацыі ажыццяўлялася з дапамогай метаду музейнага мадэлявання, які займае асобнае месца ў музеялогіі, паколькі мадэль гістарычнай рэальнасці, што ствараецца ў працэсе музейнай дзейнасці, адлюстроўвае і ўвасабляе гістарычную рэчаіснасць, з якой былі ўзяты музейныя прадметы. Акрамя таго, былі выкарыстаны метады сацыялагічных даследаванняў музейнай аўдыторыі, матэматычнай апрацоўкі матэрыялаў, мультымедыйных тэхналогій, метад палявых даследаванняў, метады параўнання і прагназавання.

Аналіз апублікаваных даследаванняў і неапублікаваных архіўных крыніц, іх інтэрпрэтацыя ў кантэксце гісторыі, традыцый і перспектыў развіцця полацкіх музеяў садзейнічалі таксама вырашэнню задач дадзенага дысертацыйнага даследавання.

**Другая глава** ***«Месца і роля музеяў у культурнай прасторы горада»*** прысвечана асэнсаванню сутнасці сучаснага музея ў кантэксце культурнай прасторы гістарычнага горада, дзе захаванне і рэпрэзентацыя аб'ектаў унікальнай гістарычнай тэрыторыі стала асноватворчай функцыяй музейнай дзейнасці.

**У раздзеле 2.1** ***«Музей як культурны кампанент гарадской прасторы»*** разглядаецца канцэпцыя музея як культурнага феномена грамадства і культурнага кампанента гарадской прасторы. Сацыяльна-культурная сутнасць музея заключаецца ў тым, што аснову ўсёй яго дзейнасці складаюць помнікі матэрыяльнай і духоўнай культуры, якія ён выяўляе, збірае, захоўвае, даследуе і рэпрэзентуе. Сістэмаўтвараючым фактарам музейнага асяроддзя з'яўляецца культура, што складае змест сацыякультурнага падыходу.

Аўтарам падкрэсліваецца сталая значнасць і непаўторнасць музея як феномена сучаснай цывілізацыі; пры гэтым вызначаецца, што пры ўсёй разнастайнасці навейшых тэндэнцый развіцця музеяў галоўнымі застаюцца адносіны наведвальніка музея да гістарычных традыцый і культурнай спадчыны. У сувязі з гэтым робіцца выснова, што сучасныя музеі вымушаны пашыраць поле сваёй непасрэднай дзейнасці да памераў культурнай прасторы горада ці рэгіёна. Тым болей, што культурная прастора Полацка адметна сваёй аўтэнтычнасцю, універсальнасцю і агульначалавечай значнасцю. Яна прадстаўлена унікальнымі архітэктурнымі і археалагічнымі помнікамі, разнастайнай мастацкай культурай, знакамітымі суб'ектамі культуры, непаўторным прыродным ландшафтам.

Культурная прастора ўспрымаецца як сістэма рэгулятыўных падстаў для чалавечай дзейнасці і яе знакава-сімвалічнага зместу, увасобленага ў шматвобразных прадуктах культурнай практыкі. Засваенне элементаў культуры адбываецца ў пэўным сацыяльным асяроддзі, якое ўздзейнічае на працэс навучання асобы культурным стандартам. У гэтым сэнсе музей заўсёды ўпісаны ў сацыякультурнае асяроддзе, і асоба праз музей павялічвае свае адаптацыйныя магчымасці адносна рэальна



Репозиторий БГУКИ

існуючай сацыякультурнай прасторы. Музей становіцца сродкам арганізацыі сацыякультурных працэсаў у межах пэўнай тэрыторыі, стварае дзеючую аснову, якая дазваляе ўзнавіць функцыянаванне рэгіёна як адзінага культурнага арганізма.

**У раздзеле 2.2 *«Музеефікацыя як метад захавання гісторыка-культурнай спадчыны»*** адзначаецца, што музеефікацыя помнікаў гісторыі і культуры – гэта спецыфічны напрамак музейнай дзейнасці супрацоўнікаў Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка.

Важнейшым дасягненнем сучаснай музеялогіі стала абгрунтаванне ідэі ўключэння ў працэс музеефікацыі культурна-гістарычнага і прыроднага асяроддзя, а таксама нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Музеефікацыя Сафійскага сабора сведчыць, што кропкавыя аб'екты гарадской культурнай прасторы можна захоўваць і выкарыстоўваць толькі ў гістарычным асяроддзі. З гэтай нагоды намі разглядаецца канцэпцыя музеефікацыі ўсяго гістарычнага цэнтра Полацка як адзінага цэлага. Але практычна гэта магчыма толькі пры ўмове захаванасці унікальнай гістарычнай тэрыторыі. На наш погляд, найбольш адпавядае гэтай мэце мадэль запаведніка, у рамках якога ёсць магчымасць аб'яднаць намаганні ўсіх суб'ектаў культуры на шляху захавання культурнай спадчыны рэгіёна. Для гэтага ў першую чаргу неабходна надаць тэрміналагічны і юрыдычны статус унікальнай гістарычнай тэрыторыі, стварыць адпаведную нарматыўна-прававую базу адносна музеяў і культурна-гістарычнай спадчыны. У гэтым напрамку можна выкарыстоўваць вопыт аўтарытэтных міжнародных арганізацый, напрыклад, ІКАМОСа, прынаўшага «Хартыю захавання гістарычных гарадоў і гарадскіх абшараў» (Вашынгтон, 1987). Суб'ектамі культуры Полаччыны распачата такая дзейнасць. На мяжы стагоддзяў дзяржаўнымі і грамадскімі арганізацыямі распрацаваны і зацверджаны шэраг нарматыўных дакументаў, якія рэгулююць дзейнасць полацкіх музеяў. Так, у 2000 г. была прынята *Комплексная доўгатэрміновая праграма развіцця Полацка і Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка на 2000–2005 гг.* Працягам на шляху далейшага развіцця музеефікацыі культурнай прасторы горада стала *Комплексная праграма развіцця Полацка на 2008–2012 гг.*

**У трэцяй главе *«Музеі Полацка ў гісторыка-культурным патэнцыяле рэгіёна»*** разглядаюцца інфармацыйны і камунікатыўны патэнцыял полацкіх музеяў, фарміраванне і функцыянаванне якіх стала адначасова вынікам і ўмовай развіцця лакальных культурных працэсаў у рэгіёне. Полацкія музеі падаюцца як сродкі арганізацыі сацыякультурных працэсаў, адным з якіх у ХХ ст. стаў працэс музеефікацыі гісторыка-культурнай прасторы Полацка ў межах старажытнага горада.

**Раздзел 3.1 *«Інфармацыйны і камунікатыўны патэнцыял музеяў полацкіх навучальных устаноў XVIII–XIX стст.»*** Музеі полацкіх навучальных устаноў XVIII–XIX стст. узніклі на падмурку дэмакратызацыі сістэмы адукацыі з мэтай уключэння іх інфармацыйнага і камунікатыўнага патэнцыялу ў адукацыйны і выхаваўчы працэс. Іх узнікненне ў Полацку ў другой палове XVIII ст., як і ва ўсёй Еўропе, было звязана з асветніцкім характарам прадмузейных збораў, развіццём і дыферэнцыяцыяй навук. Адсутнасць публічных устаноў музейнага тыпу абумовіла з'яўленне «музеумаў» і «кабінетаў» у складзе вышэйшых, а потым і сярэдніх навучальных устаноў. Іх зборы пашыралі кругагляд вучняў, выхоўвалі мастацкі густ, спрыялі засваенню ведаў, пабуджалі да ўдзелу ў даследаванні гісторыі і прыроды краю. Гэта сведчыла аб зараджэнні адукацыйна-выхаваўчай функцыі музеяў. Акрамя таго, дзякуючы энтузіязму асобных настаўнікаў, зборы музеяў падчас ператвараліся ў сапраўдныя навуковыя лабараторыі. Яны вызначаліся навуковай апрацоўкай музейных рэчаў і цэлых калекцый, а часам і нязвыклай экспазіцыяй. Да шэрагу такіх музеяў адносіўся і *Музей Полацкага езуіцкага калегіума (1788–1820 гг.)*. Аналіз яго дзейнасці дае падставу сцвярджаць, што музей такой навучальнай установы, як езуіцкі калегіум (а потым акадэмія), з'явіўся сапраўднай навуковай лабараторыяй. Акрамя таго, гэта быў першы на Беларусі музей, для якога ў 1788 г. Г. Груберам быў пабудаваны спецыяльны корпус, дзе месціліся музей, карцінная галерэя, бібліятэка і архіў. Паколькі ў XVIII ст. яшчэ не скаліся прынцыповыя прычыны іх раздзялення, то аўтар разглядае іх як адно цэлае. Намі вызначана больш за 20 музейных калекцый, якім была ўласціва дасканалая навуковая апрацоўка, характэрная для еўрапейскіх музеяў таго часу. Тым не менш, значная ўвага надавалася збору і вывучэнню мясцовых матэрыялаў і гісторыі горада.

У стварэнні і развіцці музея ўдзельнічалі знакамітыя выкладчыкі Францыск Ксаверый Схопфер, Кшыштаф Схмідт і Ян Сомерэр, бібліятэкар і адначасова прафесар архітэктуры Антоні Абрамсперг, кіраўнік майстэрні, у якой вырабляліся неабходныя для музея механізмы, Ян Вогт, прафесар натуральнай гісторыі Францішак Рыка і «наглядчык музеума» Юзэф Цітовіч, прафесар архітэктуры і вучань Грубера Юзэф Палонскі, прафесар эксперыментальнай фізікі Мацвей Тэйн, прафесар філасофіі і матэматыкі Станіслаў Пятровіч, матэматыкі Фадзей Машэўскі і Францішак Дзержынскі.

Экспазіцыі даследуемага музея, вопыт яго супрацоўнікаў былі пазней выкарыстаны іншымі навучальнымі установамі. Так, на рэштках Музея езуітаў былі створаны і існавалі пэўны час (1820–1918 гг.) *Музей піярскага вучылішча і Музей кадэцкага корпуса*, якія прадоўжылі традыцыі Музея езуіцкага калегіума, дзе дыдактычны прынцып фарміравання калекцый заставаўся асноўным. Як і раней, пры езуітах, музеі названых устаноў не толькі ўтрымлівалі прадметы, неабходныя для навучання, але і збіралі экспанаты, якія распавядалі пра гісторыю існавання той ці іншай навучальнай установы Полацка. Музей кадэцкага корпуса прымаў актыўны ўдзел у выставачнай дзейнасці, праводзячы перасоўныя выставы (Ніжні Ноўгарад, 1896 г.). Па нашым меркаванні, музейная дзейнасць полацкіх кадэтаў стварыла ўмовы для фарміравання ўстойлівай цікавасці да гісторыі краю пэўнага кола краязнаўцаў-аматараў з ліку кадэтаў і выкладчыкаў (В.П. Вікенцьеў, А.П. Тыртаў, І.І. Даўгоў, М.І. Зорын, Я.І. Стаброўскі, А.К. Марэль, Л.Л. Кірпічоў і інш.), якія цікавіліся гісторыяй Полаччыны і прымалі непасрэдны ўдзел у яе даследаванні.

**Раздзел 3.2 *«Развіццё музейных традыцый у культурнай прасторы Полацка ў ХХ ст.»*** На больш высокі ўзровень працэс музеефікацыі культурнай прасторы горада падняўся ў ХХ ст. Пасля 1917 г. арганізацыяй музеяў у Полацку стаў займацца аддзел народнай адукацыі. Помнікі архітэктуры і археалогіі былі ўзяты пад пільную ўвагу аматараў музейнай справы. Ужо тады было пастаўлена пытанне не толькі аб іх захаванні і рэстаўрацыі, але і аб навуковым вывучэнні і фіксацыі, а галоўнае – аб належным прыстасаванні (пад музейныя ўстановы).

У Полацку – горадзе, які меў багатыя гісторыка-культурныя традыцыі, – раней, чым у іншых месцах Беларусі, усвядомілі неабходнасць музеефікацыі аб'ектаў гарадскога асяроддзя. Значных поспехаў у гэтым напрамку дасягнула Полацкая павятовая камісія па ахове помнікаў даўніны і мастацтва, якая пачала працаваць





Репозиторий БГПУ

летам 1920 г. Асноўнай задачай сваёй дзейнасці камісія лічыла стварэнне «універсальнага» музея ў Полацку і імкнулася зрабіць усё неабходнае для гэтага. Супрацоўніцтва сяброў камісіі, краязнаўчага таварыства і аматараў гісторыі горада (П.І. Дэйніса, І.П. Дэйніса, П.М. Пяроўскага, А.С. Еленева, С.М. Мялешкі і інш.) стварыла фенаменальныя ўмовы для спалучэння музейнага будаўніцтва з музеефікацыяй гарадскога асяроддзя, што стала традыцыйным для развіцця музейнай справы ў горадзе.

У 1926 г. на фоне дзяржаўнай палітыкі, якая да 1930-х гадоў падтрымлівала краязнаўчы рух у лепшых яго традыцыях, быў адкрыты Краязнаўчы музей. Праўда, з 1936 г. дзейнасць музея была прымусова скіравана на ідэалагічную падтрымку сацыялістычнага будаўніцтва. Тым не менш, суб'ектыўны фактар, а менавіта адносіны музейных супрацоўнікаў (В.А.Карэлінай, В.А. Гаціха, М.М. Казлёнка, П.А. Агурка, А.В. Коршунава) да захавання і вывучэння гісторыка-культурных каштоўнасцей Полацка, выхоўвалі ў гараджан цікавасць да спадчыны і спрыялі фарміраванню нацыянальнай самасвядомасці. Разам з невялікай колькасцю музейных рэчаў, што засталіся ад музеяў навучальных устаноў, захаваліся і былі творча развіты музейныя традыцыі. Працэс дэмакратызацыі краіны пасля 1956 г. узмацніў цікавасць да айчыннай гісторыі і культуры, што ў сваю чаргу адбілася на стане музейнай справы і гісторыка-культурнай спадчыны. У 1960-х гадах комплексны падыход да яе вывучэння і захавання стаў адметнай рысай працы Полацкага краязнаўчага музея, на базе якога ў 1967 г. быў створаны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік.

**У чацвёртай главе** ***«Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік (1967– 2008 гг.)»*** у кантэксце музейнага будаўніцтва ў Полацку вызначаны ўмовы стварэння, этапы фарміравання, асноўныя напрамкі работы музея-запаведніка, функцыянальная мадэль яго развіцця і роля музеяў у захаванні гісторыка-культурнай спадчыны горада. У сучасных умовах бытаванне музея-запаведніка разглядаецца як адносіны грамадства да культурнай спадчыны, як дзейнасць, якая павінна стаць складовай часткай рэгіянальных культурных працэсаў, а музейная сетка горада – сфарміравацца ў самастойны культурна-гаспадарчы комплекс.

**У раздзеле 4.1** ***«Стварэнне запаведніка і развіццё музейнай сеткі»*** разглядаецца працэс узнікнення буйнейшага на Беларусі музея-запаведніка.

Узнікненне такога тыпу музея дэтэрмінавана пашырэннем зместу паняцця музейнага прадмета, уключэннем у музейныя экспазіцыі не толькі асобных рэчаў, але і асяроддзя іх бытавання. Аналагічныя артэфакты матэрыяльнай і духоўнай культуры ў сярэдзіне XX ст. пачалі музеефікавацца ў Расіі і шэрагу іншых еўрапейскіх краін. Дзяржаўнымі і грамадскімі арганізацыямі Беларусі быў прааналізаваны стан музейнай справы ў краіне і ў замежжы, вынікі якога знайшлі адлюстраванне ў шэрагу нарматыўна-прававых дакументаў. У прыватнасці Міністэрствам культуры БССР у 1968 г. было зацверджана «Палажэнне аб гісторыка-археалагічных запаведніках», на падставе якога распачалася дзейнасць па стварэнні Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка. Рэстаўрацыя і музеефікацыя аб'ектаў, уключаных у структуру музея-запаведніка, пачалася ў 1970-х гадах і працягваецца да нашага часу.

Сучасная структура запаведніка ўяўляе сабой музейнае аб'яднанне (11 філіялаў: Музей гісторыі архітэктуры Сафійскага сабора, Краязнаўчы музей, Музей баявой славы, Музей-кватэра Героя Савецкага Саюза З.М. Тусналобавай–Марчанка, Музей беларускага кнігадрукавання, Музей-бібліятэка Сімяона Полацкага, стацыянарная выстава «Прагулка па Ніжне-Пакроўскай», Музей традыцыйнага ручнога ткацтва Паазер'я, Дзіцячы музей, Мастацкая галерэя, Прыродна-экалагічны музей) з некалькімі агульнымі для ўсяго запаведніка аддзеламі (аддзел фондаў, навукова-рэстаўрацыйны, навукова-асветніцкі, навукова-інфармацыйны). У 1980–1990-х гадах, калі ў музейным праектаванні вядучым стаў эксперыментальны напрамак, ідэя музейнага аб'яднання на прынцыпах фарміравання цэнтралізаванай сістэмы музеяў розных профіляў атрымала тэарэтычнае і фактычнае абгрунтаванне.



Асновай экспазіцыі Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка з'яўляецца гістарычны цэнтр старажытнага горада з яго помнікамі архітэктуры, у інтэр'ерах якіх (як вынік музеефікацыі) размешчаны: музейныя экспазіцыі, выставачныя залы, канцэртныя залы камернай і арганнай музыкі, бібліятэка з чытальнай залай, клас для заняткаў па музейнай педагогіцы, студыі для заняткаў народнымі промысламі (ткацтва, пляценне паясоў). На нашу думку, музеефікацыя прадугледжвае рэстаўрацыю, захаванне і выкарыстанне помнікаў у музейных мэтах, а таксама – высвятленне патэнцыяльна закладзенай у помніках інфармацыі. Музеефікацыю пажадана праводзіць згодна з агульна- прынятым законам, паэтапна. Першым этапам музеефікацыі можа быць вызначэнне ўсіх элементаў комплексу, якія падлягаюць абавязковаму захаванню. Другім этапам можа быць узнаўленне страчанага, трэцім – арганізацыя працэсу ўспрымання экспазіцыі наведвальнікам. Чацвёрты этап – пабудова візуальна-прасторавых сувязей паміж асобнымі экспазіцыйнымі тэрыторыямі, што асабліва важна і неабходна для стварэння агульнай экспазіцыі такога музейнага аб'яднання, як запаведнік.

**У раздзеле 4.2** ***«Структура і асноўныя напрамкі дзейнасці музея-запаведніка»*** даследуюцца асноўныя структурныя адзінкі запаведніка і накірункі яго дзейнасці.

Навукова-даследчая і навукова-фондавая дзейнасць запаведніка забяспечваюць адну з асноўных сацыяльных функцый музея – функцыю дакументавання, якая абумоўлена пашырэннем геаграфічнага дыяпазону і тэматычнага складу музейнага збору, тэндэнцыяй комплекснага захавання і рэвіталізацыі культурна-гістарычнай спадчыны.

Як і дакументаванне, адукацыйна-выхаваўчая дзейнасць застаецца важнейшай функцыяй музея. Заснаваная на інфарматыўных магчымасцях музейных прадметаў і іх эмацыянальным уздзеянні, яна накіравана на выкананне адукацыйных, маральна-выхаваўчых і эстэтычных задач. У айчыннай музеялогіі на змену назве «адукацыйна-выхаваўчая функцыя» прыйшло новае паняцце – «музейная камунікацыя». Яна адлюстроўвае новыя метадыкі работы з наведвальнікамі і музейна-педагагічныя праграмы, вывучае гісторыю адукацыйнай дзейнасці музеяў і ўздзеянне музейных формаў камунікацыі на музейную аўдыторыю.

Супрацоўнікамі музея-запаведніка можа вырашацца комплекс задач адукацыйна-выхаваўчага характару, накіраваных на фарміраванне ў асобы культурных каштоўнасцей, нормаў, ідэалаў, патэрнаў паводзін, высокіх маральных якасцей. Такая дзейнасць павінна пачынацца з дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту, калі дзяцей рыхтуюць да ўспрымання музейнай экспазіцыі. Формы іх самыя розныя: гульні, тэатралізаваныя відовішчы, экскурсіі, урокі, лекторыі, факультатывы па краязнаўству і інш. Для студэнтаў – комплексныя лекторыі, лекцыі, канцэрты камер-



Репозиторий БГУКИ

най і арганнай музыкі, вытворчыя практыкі. На базе запаведніка могуць працаваць курсы па падрыхтоўцы экскурсаводаў з ліку старшакласнікаў гімназіі і студэнтаў полацкіх навучальных устаноў.

Вялікую ўвагу надаюць супрацоўнікі музея-запаведніка развіццю новага напрамку – навукова-інфармацыйнай дзейнасці, укараненню сучасных тэхналогій. У 1999 г. пачалася работа па стварэнні сайта і электронных каталогаў музейных калекцый. Сёння галоўнай задачай у гэтым напрамку стала стварэнне адзінага музейнага сервера *museum.by*. Развіццё міжмузейнага адзінства спалучаецца з узнікненнем і хуткім ростам міжмузейнай інфармацыйнай прасторы, якая стала новай формай пераадолення замкнутасці музея як сацыякультурнага інстытута.

**У раздзеле 4.3** ***«Функцыянальная мадэль развіцця запаведніка і захавання гісторыка-культурнай спадчыны горада»*** падаецца распрацаваная аўтарам канцэпцыя захавання культурнай спадчыны Полаччыны.

На наш погляд, аб'ектамі музейнага паказу ў музеі-запаведніку павінны стаць не толькі рухомыя артэфакты, але і археалагічныя, архітэктурныя помнікі, ансамблі гарадской забудовы і гістарычныя ландшафты. Для гэтага неабходна ажыццявіць комплексную рэгенерацыю ансамбля галоўнай гарадской плошчы. Далейшую музеефікацыю культурнай прасторы горада неабходна праводзіць з улікам спецыфікі аб'ёмна-прасторавага планіровачнага каркаса, канфігурацыі Дзвіны і Палаты, агульнагарадскога сілуэта, захаваўшыхся архітэктурных ансамбляў. Гарадская прастора патрабуе напаўнення яе археалагічнымі аб'ектамі і малымі формамі. У будучым у структуру музея-запаведніка можна ўключыць шэраг новых музеяў: археалогіі, зброі, ганзейскага гандлю, старога горада, знакамітых палачан і інш. Музей-запаведнік можа эфектыўна выконваць сваю місію пры наяўнасці ў яго штатным раскладзе спецыяльна падрыхтаваных для гэтага тыпу музея высокакваліфікаваных кадраў. У структуры музея-запаведніка павінен існаваць сучасны цэнтр па рэстаўрацыі і кансервацыі артэфактаў старажытнай культуры. У дачыненні да музея-запаведніка неабходна выпрацаваць асобную мадэль культурнага турызму, якая карэнным чынам будзе адрозніваца ад звычайных формаў масавага турызму і не будзе ствараць для запаведніка шкоднай нагрузкі. У культурнай прасторы горада музей-запаведнік павінен весці актыўную работу па захаванні і рэпрэзентацыі культурнай спадчыны Полаччыны, абапіраючыся на музейныя традыцыі і з улікам новых дасягненняў сучаснай музеялогіі.

Асноўнай задачай па рэалізацыі такой мадэлі з'яўляецца распаўсюджванне фондавай дзейнасці музеяў на ўсе катэгорыі помнікаў горада, у тым ліку і на нерухомыя, а таксама на шматкампанентныя асяродкавыя комплексы, якія яны фарміруюць. Вырашыць такую задачу можна пры ўмове пастаноўкі ўсіх аб'ектаў, якія маюць культурна-гістарычную каштоўнасць, на ўлік; пры ўмове правядзення іх атрыбуцыі і навуковай інвентарызацыі; пры ўмове падтрымання аптымальнага рэжыму іх бытавання ў культурнай прасторы горада. Безумоўна, музей-запаведнік павінен стварыць такі рэжым захаванасці музейных каштоўнасцей, пры якім усе яны маглі б быць дастаткова даступныя для тых, хто жадае іх выкарыстоўваць у сучаснай сацыяльнай практыцы, перш за ўсё – у сацыякультурнай дзейнасці.

Дамінуючай задачай у дзейнасці музея-запаведніка становіцца сумесная навукова-даследчая работа яго супрацоўнікаў з навукоўцамі розных галін (археалагамі, гісторыкамі, этнографамі, мастацтвазнаўцамі, педагогамі, музеёлагамі і інш.).



Супрацоўнікі запаведніка здольны распрацоўваць новыя тэхналогіі і метады захавання і экспанавання археалагічных аб'ектаў, якія даследаваны беларускімі археолагамі. Станоўча зарэкамендавала сябе такая форма навуковай дзейнасці, як правядзенне на базе музея-запаведніка навукова-практычных канферэнцый і семінараў, мастацкіх пленэраў і выстаў. Сведчаннем навуковай кампетэнтнасці супрацоўнікаў музея-запаведніка з'яўляецца стварэнне імі маштабных дакументаў, накшталт Дасье для ўключэння полацкіх помнікаў у Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА і Стратэгіі захавання культурнай спадчыны горада.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

### Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі

1. На пачатку новага тысячагоддзя Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік у поўнай ступені выступае як сімвал стабільнасці развіцця музейнай справы краіны. Ва ўмовах музеефікацыі цэлых гістарычных тэрыторый, як гэта адбываецца ў Полацку, музей ужо сёння становіцца неад'емнай часткай яго культурнай прасторы, сродкам самаідэнтыфікацыі беларускага народа, фарміравання яго самасвядомасці на падмурку спрадвечных агульначалавечых маральных каштоўнасцей і прынцыпаў, закладзеных у культурна-гістарычнай спадчыне. Культурная прастора Полацка сфарміравалася ў выніку шматвяковай палітычнай, сацыяльна-эканамічнай і культурнатворчай дзейнасці беларускага народа. Яна прадстаўлена унікальнымі гістарычнымі і культурнымі помнікамі, багатай нематэрыяльнай спадчынай, шэраг артэфактаў якой маюць сусветнае значэнне. Асаблівасцю полацкай культурнай прасторы з'яўляецца яе аўтэнтычнасць, разнастайнасць і адносна добрая захаванасць. Усведамленне універсальнасці і агульначалавечай значнасці культурнай спадчыны Полацкага рэгіёна садзейнічала развіццю збіральніцкай і калекцыйнай дзейнасці, на аснове якой ужо ў XVIII ст. распачынаецца працэс музеефікацыі асобных помнікаў гісторыі і культуры Полаччыны. З цягам часу музеі горада становяцца складовай часткай рэгіянальных культурных працэсаў, а музейная сетка горада выдзяляецца ў самастойны культурна-гаспадарчы комплекс.

Музейныя традыцыі Полацка бяруць пачатак у XI–XII стст., калі ў Сафійскім саборы і Спасаўскім манастыры пачалі збіраць кнігі і абразы. Умоўна манастырскія скарбы можна назваць калекцыямі музейнага характару. Іх існаванне ў XI–XVIII стст. стала падмуркам, на якім са стварэннем музея ў Полацкім езуіцкім калегіуме пачалося музейнае будаўніцтва ў горадзе. Музей, як сацыякультурны інстытут, з'яўляецца ў грамадстве, якое знаходзіцца на высокім узроўні сацыяльнага і культурнага развіцця. У Полацку гэтаму папярэднічала вялікая калекцыйная і збіральніцкая дзейнасць выдатных асоб і сацыяльных груп. [1; 2; 4; 9; 10; 11; 12; 15; 16; 19; 20; 21; 23; 25; 26; 28; 33; 34; 35].

2. Фарміраванне і функцыянаванне музеяў Полацка стала адначасова вынікам і ўмовай развіцця рэгіянальных культурных працэсаў, адлюстраваннем гісторыі горада і краіны ў цэлым і падзяляецца на наступныя перыяды:
1780–1926 гг. – ад музеяў навучальных устаноў Полацка да Краязнаўчага музея;
1926–1967 гг. – разгортванне Краязнаўчага музея;
1967–2008 гг. – стварэнне структуры гісторыка-культурнага музея-запаведніка.



Репозиторий БГУКИ

У выніку праведзенага даследавання выяўлены адметныя рысы кожнага з названых перыядаў. У працэсе трансфармацыі яны набылі значэнне не толькі музейных, але і агульнакультурных традыцый, якія ўзмацнілі ўплыў музеяў горада на развіццё культурнай прасторы.

Пачатак першага перыяду быў звязаны з асветніцкім характарам прадмузейных збораў, дыферэнцыяцыяй навук і рэфармаваннем у сферы адукацыйнай палітыкі Расійскай імперыі з нагоды далучэння да яе новых тэрыторый у выніку падзелаў Рэчы Паспалітай, таму развіццё музейнай справы ў Полацку мела агульнаеўрапейскія рысы. Намаганнямі полацкіх езуітаў быў створаны буйны Музей пры езуіцкім калегіуме (1788–1820 гг.), які стаў адным з першых музеяў пры навучальных установах на тэрыторыі Беларусі. Вялікая колькасць музейных рэчаў была падзелена па добра апрацаваных калекцыях і экспанавалася ў залах трохпавярховага корпуса, які быў спраектаваны і пабудаваны генералам Ордэна Г. Груберам спецыяльна для Музея. Музейны збор пашыраў кругагляд вучняў, далучаючы іх да агульначалавечых каштоўнасцей, выхоўваў мастацкі густ, спрыяў засваенню ведаў, абуджаў да даследавання гісторыі і прыроды Полацкага краю. *Адукацыйна-выхаваўчая функцыя Музея езуіцкага калегіума і акадэміі заклала падмурак для фарміравання адукацыйнай традыцыі ў музейнай справе Полацка.*

Галоўным унёскам музеяў іншых навучальных устаноў (піярскага вучылішча і кадэцкага корпуса ў 1820–1918 гг.) у музейную справу разам з выкарыстаннем музейных калекцый у дыдактычных мэтах, стала *навуковая і матэрыяльная фіксацыя жыцця горада ва ўсіх яе праявах.* Прэзентацыя калекцый атрымала новае развіццё. Яны экспанаваліся на мастацка-прамысловых выставах, што праводзіліся ў Расіі і за мяжой. Адметнай рысай развіцця музейнай справы ў гэты час стала яшчэ і *актыўная выставачная дзейнасць.*

У перыяд, калі Полацк знаходзіўся ў складзе РСФСР (1918–1924 гг.), музейным будаўніцтвам займаліся аддзел народнай адукацыі, павятовая камісія па ахове помнікаў даўніны і мастацтва і з 1925 г. – краязнаўчае таварыства. Падрыхтоўка да стварэння Краязнаўчага музея супала з пачаткам адкрыцця першых савецкіх музеяў і выпрацоўкай асноўных заканадаўчых актаў, якія рэгулявалі музейнае будаўніцтва на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі, БССР і СССР. Адметнымі рысамі былі: *прыцягненне да музеятворчай працы дарэвалюцыйных кадраў мастацкай і навуковай інтэлегенцыі; удала знойдзеныя арганізацыйныя формы ў справе збірання і захавання музейных каштоўнасцей; факт складання феномена гарадскога музея, які ўвасобіўся ў працэсе музеефікацыі; вылучэнне інстытута музея з аматарскага краязнаўчага руху.*

Другі перыяд (1926–1967 гг.) пачаўся з адкрыцця Краязнаўчага музея. Нягледзячы на імкненне партыйнага кіраўніцтва БССР накіраваць музейную справу ў рэчышча ідэалагічнай падтрымкі сацыялістычнага будаўніцтва, Краязнаўчы музей садзейнічаў захаванню гісторыка-культурных каштоўнасцей і выхаванню самасвядомасці гараджан, кансалідаваў грамадства і стаў формай праяўлення дэмакратычнай самадзейнасці насельніцтва ў адносінах да нацыянальнай спадчыны. Працэс дэмакратызацыі ў галіне культуры, які пачаўся пасля 1956 г., павялічыў цікавасць грамадства да айчыннай гісторыі, што ў сваю чаргу паўплывала на стан музейнай справы і помнікаў архітэктуры. У 1960-х гадах *комплексны падыход да вывучэння і захавання гісторыка-культурнай спадчыны* стаў адметнай рысай дзейнасці Полацкага краязнаўчага музея, на базе якога ў 1967 г. быў створаны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік.



Трэці перыяд музейнага будаўніцтва ў Полацку (1967–2008 гг.) вызначаецца ўвагай да праблем захавання гісторыка-культурнай спадчыны на дзяржаўным узроўні і стварэннем умоў для рэстаўрацыі помнікаў гісторыі і культуры. У выніку іх музеефікацыі ў структуры Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка ў перыяд з 1967 г. па 2005 г. было створана 11 пастаянных музейных экспазіцый, аб'яднаных гістарычнай тэрыторыяй горада ў адзіны комплекс. Калі эксперыментальны напрамак стаў дамінуючым у музейным праектаванні (1980–1990-я гг.), то ідэя музейнага аб'яднання на прынцыпах фарміравання цэнтралізаванай сістэмы музеяў розных профіляў і адзінай канцэпцыі, звязанай з унікальнай гісторыка-культурнай прасторай горада, атрымала тэарэтычнае і фактычнае абгрунтаванне на прыкладзе Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка. [2; 3; 10; 11; 12; 15; 19; 20; 22; 24; 28; 32].

3. Музеефікацыя рэгіянальнай культурнай спадчыны Полаччыны непасрэдна звязана з дзейнасцю канкрэтных суб'ектаў культуры, без якіх стварэнне музеяў і развіццё музейнай справы ў Полацку было б немагчыма. Менавіта дзякуючы іх дзейнасці былі створаны полацкія музеі і ўсвядомлена важнасць аховы і рэпрэзентацыі гісторыка-культурнай спадчыны даследуемага рэгіёна. Удзельнікамі музейнага будаўніцтва ў Полацку былі людзі розных прафесій і сацыяльнага становішча. Вучоныя з еўрапейскай адукацыяй на чале з Г. Груберам стварылі Музей езуіцкага калегіума. Выкладчыкі кадэцкага корпуса прымалі актыўны ўдзел у рабоце свайго музея, вывучалі гісторыю краю, спрабавалі стварыць музей мясцовых помнікаў старасвеччыны, гурток аматараў археалогіі і «падземны музей» у Сафійскім саборы. Гэты перыяд музейнага будаўніцтва даў шмат імёнаў людзей, якія пакінулі надрукаваныя і рукапісныя ўспаміны пра сваё захапленне гісторыяй і ідэяй стварэння музея. Сярод іх: І.І. Даўгоў, А.К. Марэль, М.І. Зорын, А.П. Тыртаў, Я.І. Стаброўскі, М.Н. Кайгародаў і інш. Апантанныя ідэяй стварэння «універсальнага музея», аматары музейнай справы П.І. Дэйніс, І.П. Дэйніс, С.М. Мялешка здолелі адкрыць у Полацку ў 1926 г. Краязнаўчы музей. Выключную ролю ў музейным будаўніцтве ў першай палове XX ст. адыгралі В.А. Гаціх, Г.Ц. Дзідэнка, П.І. Дэйніс, А.С. Еленеў, В.А. Карэліна, У.І. Курэк, П.М. Пяроўскі і інш. Усіх іх аб'ядноўвала ідэя стварэння музейнага асяроддзя ў гарадской прасторы і ператварэння Полацка ў горад-музей. Важкі ўклад у стварэнне музея-запаведніка ўнеслі Н.А. Андрэева, А.А. Комнычаў, В.Д. Краско, В.А. Купрыянаў, Г.П. Ладзісава, І.А. Мацюшкін, В.Р. Слюнчанка, В.І. Траццякова, Э.М. Хазін і інш. Пад «музеем» яны разумелі не толькі будынак, але і само гарадское асяроддзе, упершыню звярнуліся да праблемы захавання помнікаў архітэктуры і іх абавязковай музеефікацыі, што мела непасрэдны ўплыў на далейшае развіццё музейнай справы і з'яўленне феномена гарадскога музея і музея-запаведніка ў Полацку. [2; 3; 6; 7; 11; 12; 19; 20; 27].

4. Традыцыі, якія былі характэрнымі для кожнага з перыядаў музейнага будаўніцтва ў Полацку, атрымалі якаснае праламленне ў бытаванні разнастайных тыпаў і відаў музеяў. У працэсе музеефікацыі ў культурнай прасторы горада былі створаны музеі навучальных устаноў (езуіцкага калегіума, піярскага вучылішча, кадэцкага корпуса), Краязнаўчы музей, Музей баявой славы, Музей-кватэра Героя Савецкага Саюза З.М. Тусналобавай-Марчанка, Музей гісторыі архітэктуры Са-



Репозиторий БГУКИ

фійскага сабора, Музей беларускага кнігадрукавання, Музей-бібліятэка Сімяона Полацкага, Музей традыцыйнага ручнога ткацтва Паазер'я, Мастацкая галерэя, Дзіцячы музей, Прыродна-экалагічны музей.

Музейная сетка Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка складаецца з 65 аб'ектаў, унесеных у Дзяржаўны Спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. Супрацоўнікамі музея-запаведніка можа вырашацца комплекс задач, якія вынікаюць з шматаспектнай навукова-даследчай, навукова-фондавай, захавальніцкай, адукацыйнай, выхаваўчай, інфармацыйнай, рэстаўрацыйнай, выставачнай, эканамічна-фінансавай, міжнароднай і культуратворчай дзейнасці. [5; 6; 11; 14; 15; 17; 18; 20; 21; 27; 30; 31].

5. Даследаванне ролі і месца музеяў Полацка ў культурнай прасторы горада дало магчымасць распрацаваць канцэпцыю і мадэль функцыянавання і далейшага развіцця Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка і стратэгію аховы гісторыка-культурнай спадчыны горада. На наш погляд, аб'ектам музеефікацыі павінен стаць увесь гістарычны цэнтр горада. З гэтай мэтай неабходна ажыццявіць комплексную рэгенерацыю ансамбля галоўнай гарадской плошчы. Музеефікацыя помнікаў культуры і гісторыі павінна весціся з улікам спецыфікі аб'ёмна-прасторавага планіровачнага каркаса, канфігурацыі Дзвіны і Палаты, агульнагарадскога сілуэта, архітэктурных ансамбляў, якія захаваліся. Музей-запаведнік не можа функцыяваць без наяўнасці сучаснага рэстаўрацыйнага цэнтра, укамплектаванага кваліфікаванымі кадрамі. Гарадскую прастору неабходна напоўніць музеефікаванымі археалагічнымі аб'ектамі. Пазбегнуць шкоднай нагрузкі (прымусовай амартызацыі) на музей-запаведнік магчыма пры наяўнасці спецыяльнай мадэлі культурнага турызму, якая карэнным чынам адрозніваецца ад звычайных формаў масавага турызму. Ахова і рэпрэзентацыя музеямі культурнай спадчыны залежыць ад супрацоўніцтва запаведніка з міжнароднымі арганізацыямі (напрыклад, ЮНЕСКА, ІКАМОС). У будучым у Полацку можна будзе стварыць шэраг музеяў (старога горада, зброі, археалогіі, ганзейскага гандлю, знакамітых палачан, літаратуры, народнай медыцыны і інш.), якія стануць складовай часткай запаведніка. Уключэнне Сафійскага сабора, помніка архітэктуры XI–XVIII стст., і Спаса-Праабражэнскай царквы, помніка архітэктуры і манументальнага жывапісу XII ст., разам з буйнымі буфернымі (ахоўнымі) зонамі ў сусветнаядомы спіс – гэта складовая частка канцэпцыі захавання і інтэрпрэтацыі гісторыка-культурнай спадчыны горада. Дадзеная мадэль вызначае асноўныя прыярытэты, крытэрыі і накірункі аховы культурнай спадчыны Полацка з улікам глабалізацыйных трансфармацый, развіцця горада і інтэграцыі сучаснай архітэктуры ў гістарычную забудову, не парушаючы гістарычнага вобраза горада, прытрымліваючыся прынцыпу комплекснага захавання спадчыны на аснове збалансаваных і гарманічных адносін паміж патрабаваннямі грамадскасці, эканамічнай дзейнасці і аховы гістарычнага асяроддзя [2; 3; 6; 14; 15; 19].

**Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў**

Матэрыялы даследавання выкарыстоўваліся: для складання праграмных дакументаў Беларускага нацыянальнага камітэта ІКОМ; для напісання дасье на помнікі Полацка пры намініраванні іх у Сусветны спіс культурнай спадчыны ЮНЕСКА; для стварэння вэб-сайта Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка; для арганізацыі спецыяльных курсаў па музеязнаўству на гісторыка-



філалагічным факультэце Полацкага дзяржаўнага універсітэта (ПДУ); для распрацоўкі Стратэгіі захавання гісторыка-культурнай спадчыны Полацка. Вынікі дысертацыйнага даследавання знайшлі месца ў дзейнасці дзяржаўных органаў кіравання і ПДУ (Акты ўкаранення ад 20.06.2008 г.; 03.09.2008 г.).

Вынікі даследавання могуць мець практычны выхад у наступных напрамках:

- шырокі фактычны матэрыял дадзенай работы можа стаць асновай для далейшых гісторыка-культуралагічных пабудоў, для стварэння абагульняючых работ па тэорыі і гісторыі музеязнаўства;
- высновы дадзенай работы могуць быць улічаны пры стварэнні агульных курсаў па гісторыі культуры Полаччыны, спецыяльных курсаў па музеязнаўству для ВНУ;
- навуковыя распрацоўкі, палажэнні, музеяграфічныя апісанні і вэб-сайт могуць служыць дадатковай прафесійнай і навукова-асветніцкай інфармацыяй для супрацоўнікаў музеяў розных профіляў і для наведвальнікаў гэтых музеяў;
- матэрыялы дадзенай навуковай работы могуць быць карыснымі музеям для больш канкрэтнага ўсведамлення сваёй значнасці і месца ў культурнай прасторы рэгіёна і краіны ў цэлым;
- практычная значнасць даследавання заключаецца яшчэ і ў абагульненні гістарычнага вопыту, які можа быць запатрабаваны для вырашэння актуальных пытанняў узаемадзейнасці глабальнай і рэгіянальнай культур, канкрэтнай асобы і дзяржавы.

БІБЛІЯТЭКА
Беларускага ... універсітэта ... культуры
ІНВ. №

## СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ СУІСКАЛЬНІКА

### Артыкулы ў навуковых рэцэнзуемых часопісах


1. Джумантаева, Т.А. Предметы литургического обихода и личного благочестия XI–XIII веков в музейном собрании Национального Полоцкого историко-культурного музея-заповедника /Т.А. Джумантаева // Вест. Полоц. гос.ун-та. Сер. А, Гуманитарные науки. – 2005. – № 7. – С. 116–123.
2. Джумантаева, Т.А. Музеелагічны аспект перспектыўнага развіцця Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка / Т.А. Джумантаева // Вестн. Полоц. гос. ун-та. Сер. А, Гуманитарные науки. – 2006. – № 1 – С. 2–10.
3. Джумантаева, Т.А. Канцэпцыя і стратэгія захавання культурнай спадчыны Полацка /Т.А. Джумантаева //Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. – 2008. – № 10. – С. 128 – 135.


### Артыкулы ў навуковых часопісах і зборніках


4. Джумантаева, Т.А. Партрэт Эльжбеты Агінскай Пузыны з фондаўПолацкага гісторыка-культурага музея-запаведніка /Т.А. Джумантаева //Przegląd Wzchodni = Усходні агляд. – 2001. – Т. VII. – Z. 4 . – S. 1061–1068.
5. Джумантаева, Т.А. К вопросу об освоении Интернета музеями Полоцка /Т.А. Джумантаева //История и компьютер: Инф. бюллетень Ассоциации «История и компьютер». – М., 2002. – Вып. 30, июнь 2002. – С. 105 – 106.
6. Джумантаева, Т.А. Перспективы развития Национального Полоцкого историко-культурного музея-заповедника в свете музеефикации уникальной исторической территории города /Т.А. Джумантаева //Актуальныя праблемы культуры і мастацтва [Электронны рэсурс] / Нац. б-ка Беларусі. – Электрон. дан. (8,5 Мб.). – Мінск, 2007. – Вып. 1. – 1 электрон. апт. дыск (CD-ROM): зв., цв.


### Матэрыялы канферэнцый


7. Джумантаева, Т.А. К вопросу о музеефикации исторической территории Полоцка / Т.А. Джумантаева // Матэрыялы II Міжнароднай канферэнцыі па праблемах музеефікацыі унікальных гістарычных тэрыторый / Полац. гіст.-культур. музей-запаведнік; уклад. Т.А. Джумантаева. – Полацк, 1996. – С. 9–13.
8. Джумантаева, Т.А. Метадычныя рэкамендацыі па складанню тэматычных каталогаў музейных калекцый Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка / Т.А. Джумантаева //Матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі : па выніках навук.-даследчай работы ў 1996г. / Полац. гіст.-культур. музей-запаведнік ; укдад. Т.А. Джумантаева. – Полацк, 1997. – С. 13.
9. Джумантаева, Т.А. К вопросу об участии Полоцка в ганзейской торговле в XIII–XV вв. /Т.А. Джумантаева // Матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі: па выніках навук.-доследнай работы ў 1997 г. / Полац. гіст.-культур. музей-запаведнік.; уклад. Т.А. Джумантаева. – Полацк, 1998. – С. 6–13.
10. Джумантаева, Т.А. Да пытання аб музейных традыцыях Полацка. Музей езуіцкага калегіума XVIII–XIXстст. Музеі навучальных установ XIXст. / Т.А. Джумантаева // Матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі: па выніках навук.-даследчай работы 1998 г. / Полац. гіст.-культур. музей-запаведнік.; уклад. Т.А. Джумантаева. – Полацк, 1999. – С. 7–17.
11. Джумантаева, Т.А. Краязнаўчы музей Полацка (пач. XXст. – 70-ыя гг. XX ст.) / Т.А. Джумантаева // Матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі : па выніках навук.-даследчай работы ў 1999 г. / Нац. Полац. гіст.-культур. музей-запаведнік. ; уклад. Т.А. Джумантаева. – Полацк, 2000. – С. 5–20.
12. Джумантаева, Т.А. Да пытання аб стварэнні краязнаўчага музея ў Полацку / Т.А. Джумантаева // Матэрыялы навуковай гісторыка-краязнаўчай канферэнцыі, прысвечанай 75-годдзю Полацкага краязнаўчага музея / Нац. Полац. гіст.-культур. музей-запаведнік. ; уклад. В.Д. Краско. – Полацк, 2001. – С. 29–32.
13. Джумантаева, Т.А. К вопросу об освоении Интернета музеями Полоцка / Т.А. Джумантаева // Музеі і культурная спадчына як частка глабальнай інфармацыйнай прасторы : матэрыялы міжнар. канф., Мінск-Полацк, 8–11 крас. 2002 г. / Нац. Полац. гіст.-культур. музей-запаведнік ; уклад.: Т.А. Джумантаева, А.Б. Сташкевіч. – Полацк, 2002. – С. 204–205.
14. Джумантаева, Т.А. Перспектывы развіцця Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка /Т.А. Джумантаева // Матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі: па выніках навук.-даследчай работы ў 2002г. / Нац. Полац. гіст.-культур. музей-запаведнік; уклад.: Т.А. Джумантаева. – Полацк, 2003. – С. 9–25.
15. Джумантаева, Т.А. Музейные традиции Полоцка и перспективы развития музея-заповедника /Т.А. Джумантаева // Человек, культура и общество в контексте глобализации = Human being, culture and society in the context of globalisation : материалы Междунар. науч. конф., Москва, 25-27 нояб. 2005 г. / Федер. агенство по культуре и кинематографии; Рос. ин-т культурологии; редкол.: К. Э. Разлогов [и др.]. – М.: Акад. проект, 2007. – С. 194 – 197.


### Тэзісы дакладаў


16. Джумантаева, Т.А. К вопросу о фресковой росписи Софийского собора XI века в г. Полоцке / Т.А. Джумантаева // Тэзісы дакладаў навуковых супрацоўнікаў запаведніка па выніках працы : навук.-практ. канф. ў 1989–1990 гг. / Полац. гіст.-культур. запаведнік. – Полацк, 1991. – С. 5–6.
17. Джумантаева, Т.А. Музейный предмет и его свойства / Т.А. Джумантаева // Тэзісы дакладаў навуковых супрацоўнікаў запаведніка па выніках працы: навук.-практ. канф. 1991, 1992 гг. / Полац. гіст.-культур. запаведнік. – Полацк, 1993. – С. 16.
18. Джумантаева, Т.А. Полоцк в Internet /Т.А. Джумантаева, А.Ф. Оськин // История и компьютер : тез. докл. и сообщ. VI конф. ассоц. «История и компьютер»/ Информационный бюллетень Ассоциации «История и компьютер» № 23, марта 1998 г. – М., 1998. – С. 187.
19. Джумантаева, Т.А. Музейные традиции Полоцка и феномен городского музея / Т.А.Джумантаева //Перемещение границ – изменение идентичности : тез. докл. на Междунар. семинаре по музееведению, Вильнюс – Брест – Львов, 17-24 сент. 2005 г. / Tarptautines Muziejaus Tarybos (ICOM) Lietuvos skyrius; редкол.: Виргилиюс Повилюнас. – Тракай, 2005 – С. 34 – 35.


### Фотаальбом


20. Полацк музейны = Полоцк музейный = Museums of Polotsk : фотаальбом / аўт.-


Репозиторий БГУКИ

уклад.: Т.А. Джумантаева, М.М. Ільніцкі ; фото І.У. Супраненка; пер. с англ. Ю.В. Бажэнава. – Мінск : Беларусь, 2006. – 281 с.

Артыкулы ў энцыклапедычных выданнях і перыядычным друку

21. Джумантаева, Т.А. «Прагулка па Ніжне-Пакроўскай» ці вяртанне ў Полацк пачатку стагоддзя (1910г.) / Т.А. Джумантаева // Наша слова. – 1999. – 3 сак. – С. 1
22. Джумантаева, Т.А. Да пытання аб музейных традыцыях Полацка. Музей езуіцкага калегіўма XVIII–XIXстст. / Т.А. Джумантаева // Наша слова . – 1999. – 16 чэрв. – С. 7 ; 23 чэрв. – С. 7.
23. Джумантаева, Т.А., Полацк / Г.В. Штыхаў, Т.А. Джумантаева [і інш.] // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.].– Мінск, 1999. – Т. 5. – С. 518 – 522.
24. Джумантаева, Т.А. Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік / Т.А. Джумантаева // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 1999. – Т. 5. – С. 534–535.
25. Джумантаева, Т.А. Срэбная чарка з гербам Полацка / Т.А.Джумантаева // Наша слова. – 2000. – 23 лют. – С. 7.
26. Джумантаева, Т.А. Полацк / Т.А. Джумантаева, Л.А.Сяргеенка, Г.В. Штыхаў // Беларус. энцыкл. : у 18 т. – Мінск, 2001. – Т. 12. – С. 451 – 454.
27. Джумантаева, Т.А. Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік / Т.А. Джумантаева // Беларус. энцыкл. : у 18 т. – Мінск, 2001. – Т. 12. – С. 462.
28. Джумантаева, Т.А. Музей езуіцкага калегіума і кадэцкага корпуса / Т.А. Джумантаева // Памяць. Полацк : гіст.-дак. хроніка гарадоў і раёнаў Беларусі / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал.рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2002. – С. 282–285.
29. Джумантаева, Т.А. Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік / Т.А. Джумантаева // Памяць. Полацк : гіст.-дак. хроніка гарадоў і раёнаў Беларусі / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал.рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2002. – С. 864–865.
30. Джумантаева, Т.А. Музей гісторыі архітэктуры Сафійскага сабора / Т.А. Джумантаева // Памяць. Полацк : гіст.-дак. хроніка гарадоў і раёнаў Беларусі / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал.рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2002. – С. 866.
31. Джумантаева, Т.А. Карцінная галерэя. Стацыянарная выстаўка «Прагулка па Ніжне-Пакроўскай» / Т.А. Джумантаева // Памяць. Полацк: гіст.-дак. хроніка гарадоў і раёнаў Беларусі / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал.рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2002. – С. 867–868.
32. Джумантаева, Т. [Рэцэнзія] / Т. Джумантаева // Беларус. гіст. агляд. – 2005. – Т. 12. – С. 296–299. – Рэц. на кн.: Kadulska, I. Akademia Polocka. Osrodek kultury na Kresach 1812–1820 / I. Kadulska. – Gdansk, 2004. – 312 s.

Рэкламныя выданні, буклеты

33. Софийский собор : памятник архитектуры : фотоальбом / фото И. Супраненак; текст Т.А. Джумантаевой. – Мінск : Юнипак, 2000. – 11 с.
34. Джумантаева, Т.А. Сафійскі сабор / Т.А. Джумантаева. – Мінск, 2000. – 8 с.
35. Полацкі Сафійскі сабор / аўт. тэксту Т.А. Джумантаева; фота: А.П. Дрыбаса, Дз.М. Раманюка, Э.Я. Цецярэўскага. – Мінск : Беларусь, 2005. – 57 с.



## РЭЗЮМЭ

**Джумантаева Тамара Аляксандраўна**

**Музеі Полацка ў культурнай прасторы горада**

Ключавыя словы: культурная прастора, сацыякультурны інстытут, гісторыка-культурная спадчына, музеефікацыя унікальнай гістарычнай тэрыторыі.

Мэта працы – выявіць дэтэрмінанты, сутнасць і змест музеефікацыі аб'ектаў культурнай прасторы Полацка.

Метады даследавання. Культурны сінтэз, як метад кампаратывісцкага падыходу да вывучэння культурнай прасторы. Фенаменалагічны метад, у рамках якога музей і культурная прастора разглядаюцца як асобыя сацыякультурныя з'явы. Параўнальна-гістарычны метад з выкарыстаннем канкрэтна-гістарычнага падыходу дазволіў рэканструяваць падзейны рад даследуемых працэсаў, стварыўшы трывалую факталагічную базу даследавання. Метад музейнага мадэліравання, які валодае высокай доляй навуковай дакладнасці, адлюстроўвае і ўвасабляе гістарычную рэчаіснасць, з якой узяты музейныя прадметы.

Навуковая навізна даследавання. Упершыню ў беларускай культуралогіі на прыкладзе Полацка даследуюцца такія паняцці, як феномен гарадскога музея, музей як культурны кампанент гарадской прасторы, музеефікацыя культурна-гістарычнай часткі горада, узнікненне музейнага асяроддзя ў гарадской прасторы, яго роля ў грамадстве і фарміраванне прафесіі музейнага супрацоўніка. У дысертацыі падрабязна падаецца работа музея-запаведніка як спецыфічнай музейнай адзінкі і яго роля ў працэсе музеефікацыі ўнікальнай гістарычнай тэрыторыі і захаванні гісторыка-культурнай спадчыны.

Рэкамендацыі па выкарыстанні. Матэрыялы дысертацыі выкарыстоўваюцца пры чытанні спецкурса «Музеязнаўства», пры правядзенні заняткаў па праграме «Полацказнаўства». Навуковыя распрацоўкі, палажэнні, музеяграфічныя апісанні і вэб-сайт могуць служыць дадатковай прафесійнай і навукова-асветніцкай інфармацыяй для супрацоўнікаў музеяў розных профіляў і для наведвальнікаў гэтых музеяў. Шырокі фактычны матэрыял данай работы можа стаць асновай для далейшых гісторыка-культуралагічных пабудоў, для стварэння абагульняючых работ па тэорыі і гісторыі музеязнаўства.

Сферы выкарыстання: культуралогія, музеялогія, гісторыя Беларусі, педагогіка, гістарычная інфарматыка.



Репозиторий БГУКИ

## РЕЗЮМЕ

**Джумантаева Тамара Александровна**

**Музеи Полоцка в культурном пространстве города**

Ключевые слова: культурное пространство, социокультурный институт, историко-культурное наследие, музеефикация уникальной исторической территории.

Цель работы – выявить детерминанты, сущность и содержание музеефикации объектов культурного пространства Полоцка.

Методы исследования. Культурный синтез, как метод компаративистского подхода к изучению культурного пространства. Феноменологический метод, в рамках которого музей и культурное пространство рассматриваются как особые социокультурные явления. Сравнительно-исторический метод с использованием конкретно-исторического подхода позволяет реконструировать событийный ряд исследуемых процессов, создавая надёжную фактологическую базу исследования. Метод музейного моделирования, который имеет высокий уровень научной точности, отображает и представляет историческую среду, из которой взяты музейные предметы.

Научная новизна исследования. Впервые в отечественной культурологии на примере Полоцка исследуются такие понятия, как феномен городского музея, музей как культурный компонент городской среды, музеефикация культурно-исторической части города, возникновение музейной среды в пространстве города, роль музея в обществе и формирование профессии музейного работника. В диссертации подробно описывается работа музея-заповедника как специфической музейной единицы и его роль в процессе музеефикации уникальной исторической территории и сохранении историко-культурного наследия.

Рекомендации по использованию. Материалы диссертации используются при чтении спецкурса «Музееведение», при проведении занятий по программе «Полоцковедение». Научные разработки, положения, музеграфические описания и веб-сайт могут служить дополнительной профессиональной и научно-просветительной информацией для работников музеев разных профилей и для посетителей этих музеев. Обширный фактический материал данной работы может стать основой для дальнейших историко-культурологических построений, для создания обобщающих работ по теории и истории музееведения.

Область применения: культурология, музеология, история Беларуси, педагогика, историческая информатика.



## SUMMARY

**Jumantayeva Tamara Alexandrovna**

**Polotsk museums in the cultural space of the town**

Kev words: cultural space, social and cultural institute, historical and cultural heritage, museefication of the unique historic area.

The goal of the study: to identify the determinants, nature and content of museefication the cultural space of Polotsk

Methods of investigation. Cultural synthesis, as a method of comparative approach to museum's cultural space study. Phenomenon method, within the limits of which the museum and the cultural space is observed as a particular socio-cultural phenomenae. Comparative historical method when definite historic approach is used gives us an opportunity to reconstruct the row of events of the processes investigated, giving reliable factual background of the research. Museum modelling method, which has a very high level of accuracy, reflects and displays the historical period where the museum objects are taken from.

Investigation scientific novelty. For the first time in the native culturology such concepts as the phenomenon of the town's museum, museum as a cultural part of the town's area, museefication of the historic cultural part of the town, museum surround appearing role of museum in the society and the upbringing of a museum worker trade is being investigated on the example of Polotsk. The activity of museum preserve as a particular unit of museum and its role in museefication of a unique historic area in preservation of historic cultural heritage is being carefully analysed in thesis.

Recommendation for using. Thesis materials are being used to run the student course «Museology» and school course «Polotsk study». Scientific works, museum graphical descriptions and web sites can be used as an additional professional and scientific enlightening information for the workers of the different profiles and museum visitors. A vast material observed in this work can become a basis for the further historic-cultural constructions for the creation of summarizing works on the theory of the history of the museum study.

Area for using: Culturology, Museology, History of Belarus, Pedagogics, Historical Computer Science.



Репозиторий БГУКИ

Навуковае выданне

**Джумантаева Тамара Аляксандраўна**

**Музеі Полацка ў культурнай прасторы горада**

**Аўтарэферат**
дысертацыі на на суісканне вучонай ступені
кандыдата культуралогіі

Падпісана да друку 16.04.2009. Фармат 60x84 1/16.
Папера HP. Друк лазерны

Тыраж 60 асобн.

Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік
211400, г. Полацк, вул. Ніжне-Пакоўская, 22

Репозиторий БГУКИ